УДК 94 (476) «1941/1944»

**Мяньчэня С.В.**, старшы выкладчык;
**Грэбень Я.А.**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ"

**Анатацыя:** У артыкуле раглядаецца пытанне аб месце і ролі Вялікай Айчыннай вайны ў дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь і гістарычнай памяці беларускага грамадства. Пазначаюцца асноўныя моманты работы выкладчыка па паглыбленні гэтых ведаў у студэнцкай моладзі ў кантэксце выкладання вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці".

**Absract:** The article is devoted to the question of the place and role of the Great Patriotic War in the state ideology of the Republic of Belarus and the historical memory of Belarusian society. The main points of the teacher's work to deepen this knowledge in students in the context of teaching the academic discipline "History of Belarusian Statehood" are indicated.

**Ключавыя словы:** Вялікая Айчынная вайна, гістарычная памяць, выхаваўчая работа.

**Keywords:** The Great Patriotic War, historical memory, educational work.

Вялікая Айчынная вайна займае цэнтральнае месца ў гістарычнай памяці беларускага народа і ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. Беларуская дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны [1, арт. 15]. Як адзначана ў Дырэктыве № 12 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, памяць пра ўсенародны супраціў нацызму, гераічны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца асновай, вакол якой аб'ядноўваецца беларускае грамадства [2].

Выпрабаванні, з гонарам перанесеныя народам, яго пакуты і подзвіг аказалі значны ўплыў на далейшае развіццё нашай Радзімы: сацыяльна-культурнае, грамадска-палітычнае і эканамічнае; паўплывалі на этнічныя, дэмаграфічныя і інш. працэсы. Гэтыя падзеі закранулі кожную сям'ю, а з вусных і пабытовых традыцый індывідуальных ствараецца калектыўная памяць, якая, у сваю чаргу, можа ўплываць на індывідуальную памяць і нават карэктаваць яе. У ацэнцы вайны беларускае грамадства не мае супярэчнасцей, як, напрыклад, у ацэнцы падзей распаду Савецкага Саюза, ці іншых, больш ранніх перыядаў. Значнасць падзей Вялікай Айчыннай вайны для ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці даказвае, як мінімум, той факт, што галоўнае дзяржаўнае свята – Дзень Незалежнасці – адзначаецца

3 ліпеня, у дзень вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў. Улічваючы гэтыя фактары, можна канстатаваць, што веды аб Вялікай Айчынай вайне маюць важнае значэнне ў сістэме выхавання моладзі, фарміравання пачуцця патрыятызму і актыўнай грамадскай пазіцыі.

Калі ў структуры ідэалічна-выхаваўчай работы са студэнцкай моладдзю Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта тэме Вялікай Айчыннай вайны надаецца значная ўвага (гэта і інфармацыйныя гадзіны і выяздныя мерапрыемствы з наведваннем музеяў, мемарыяльных комплексаў), то ў навучальным працэсе студэнты сустракаюцца з імі толькі ў межах дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”. Агульная колькасць адведзеных на вывучэнне тэмы аўдыторных гадзін складае 4 (2 гадзіны лекцыі і 2 на семінарскі занятак). Дысцыпліна “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)” спачатку з’яўлялася абавязковай дысцыплінай, затым атрымала статус факультатыва без формы кантроля, а пасля чарговай карэкцыі сістэмы выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін не патрапіла ў лік выкладаемых дысцыплін. У такіх умовах даць студэнтам цэласную карціну Вялікай Айчыннай вайны, закласці базіс ведаў аб лёсе і ролі беларускага ў прыватнасці і савецкага народа ўвогуле у тых падзеях, з’яўляецца складанай, але важнай задачай. На гэта ўплывае не толькі абмежаванасць часу, але і некаторыя суб’ектыўныя фактары: статус гістарычных дысцыплін як непрофільных, а таму і другасных у тэхнічным ВНУ, наяўнасць значнай колькасці іншых крыніц інфармацыі, якія для многіх студэнтаў з’яўляюцца больш прывабнымі.

Асноўнай задачай выкладчыка з’яўляецца перадача ведаў студэнтам, у выніку чаго павінны быць зфарміраваны канкрэтныя навыкі і кампетэнцыі. Наколькі прадукцыйнай з’яўляеецца такая праца дапамагае адказаць дыягностыка. Перш за ўсё выкладчык праводзіць дыягностыку ведаў студэнта ў выглядзе ўваходнага кантроля. Гэта дазваляе выявіць сярэдні ўзровень падрыхтоўкі, скарэктаваць змест заняткаў (больш увагі і часу надаць тым тэмам, па якіх студэнты паказалі найгоршыя вынікі), а таксама вызначыць студэнтаў з высокім узроўнем ведаў для працы з імі па індывідуальным заданням [3, с. 628]. Акрамя сістэмы выніковага кантроля мэтазгодна правядзенне пры магчымасці праз некаторы час кантрольных зрэзаў, вынікі якіх дапамагаюць ацаніць эфектыўнасць працы і, пры неабходнасці, правесці яе карэкціроўку.

На аснове шматгадовага вопыту выкладання гістарычных дысцыплін і правядзення дыягностыкі ведаў студэнтаў аб Вялікай Айчыннай вайне можам вызначыць наступныя праблемы і дасягненні.

Па-першае, гэта нізкі ўзровень персаніфікацыі гістарычных падзей. Аднак такая сітуацыя характэрна ў цэлым для ўсіх гістарычных перыядаў.

Так па выніках аналізу рэшткавых ведаў студэнтаў 1–3 курса (120 апытаных) у пачатку 2025 г. 36 % не змаглі назваць ніводнага ўраджэнца Беларусі – героя Вялікай Айчыннай вайны, альбо далі няправільныя адказы. Астатнія часцей за ўсё ўзгадваюць імёны Марата Казея (48 %) і Васіля Талаша (22%), Канстанціна Заслонава (10 %). Сустракаюцца адзінкавыя ўзгадванні Пятра Машэрава і Мікалая Гастэлы. Сярод вядомых дзеячаў Вялікай Айчынай вайны не знайшлося месца Мікалаю Кедышку, Герою Савецкага Саюза, аднаму з актыўных дзеячаў Мінскага антыфашысцкага падполля, пры тым, што вуліца, названая ў яго гонар, акрэслівае межы ўніверсітэцкага гарадка і вядома ўсім студэнтам.

Па-другое, трэба адзначыць пэўныя праблемы ў храналогіі і тэрміналогіі. Значная частка памылак звязана з краінамі антыгітлераўскай кааліцыі і вызначэннем саюзнікаў Германіі. 34 % не змаглі растлумачыць гістарычную аснову дзяржаўнага свята Дзень Народнага Адзінства, што, аднак, можна спісаць на тое, што ўведзена яго было ў 2021 годзе. У той жа час значна выраслі паказнікі па Дню Незалежнасці: 96% ведае гэтую дату, а 85 % могуць растлумачыць яе сэнс. Высокі паказнік і ў веданні храналагічных межаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны, тэрмінаў “генацыд” і “Халакост”, а таксама месцаў памяці (Хатынь, Брэсцкая крэпасць, Курган Славы і інш.).

Часам нізкі ўзровень ведаў знаходзіцца на мяжы нежадання атрымліваць інфармацыю і яе аналізаваць. Так, напрыклад, са з’яўленнем тэхналогій штучнага інтэлекта (ChatGPT і інш.) студэнты сталі здаваць паведамленні на тэму “Падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі маёй малой Радзімы” згенераваныя нейрасеткай, яе таннымі і незусім якаснымі варыянтамі. Яны амаль не ўтрымліваюць факталагічнай інфармацыі (напісаны агульнымі фразамі, не маюць лічбаў, назваў асобных населеных пунктаў, пры замене назвы раёна на іншую нічога не змяняецца), а часам і маюць грубыя памылкі. Каштоўнасць і важнасць тэхналогій штучнага інтэлекта несумненна, аднак нельга дапускаць атрафіравання крытычнага мыслення і фармалізацыі самастойнай работы студэнта пры злоўжыванні імі.

Улічваючы тую ўвагу, якая надаецца падзеям Вялікай Айчыннай вайны ў сістэме выхавання моладзі, веды студэнтаў Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта аб іх знаходзяцца на дастатковым узрозні пры агульным сярэднім узроўні гістарычных ведаў. Выкладчыкамі кафедры сацыяльна-гістарычных дысцыплін на сістэматычнай аснове праводзіцца праца па іх маніторынгу, удасканаленні методыкі выкладання, выкарыстоўваеццца індывідуальны падыход, праводзяцца пазааўдыторныя мерапрыемствы. Магчымымі крокамі па павышэнню прадукцыйнасцт дадзенай працы могуць быць вяртанне ў навучальны працэс дысцыпліны “Вялікая Айчынная вайна савецкага

народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”, як мінімум, на ўзроўні факультатыва, а таксама захаванне гістарычных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў завочнай формы навучання.


**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь : са змян. і дап., прынятымі на рэсп. рэферэндумах 24 лістап. 1996 г., 17 кастр. 2004 г. і 27 лют. 2022 г. – Мінск : Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2024. – 112 с.
2. Директива Президента Республики Беларусь № 12 «О реализации основ идеологии белорусского государства» от 9 апреля 2025 г.
3. Мяньчэня, С. В. Уваходны кантроль ведаў як сродак дыягностыкі і інструмент карэкцыі навучальнага працэсу (на прыкладзе гістарычных дысцыплін) / С. В. Мяньчэня // Техническое обеспечение инновационных технологий в сельском хозяйстве: сб. науч. статей Междунар. науч.-практич. конф., Минск, 26–27 нояб. 2020 г. / редкол.: Н.Г. Серебрякова [и др. ]. – Минск : БГАТУ, 2020. – С. 627–629.



**Summary.** The lecturers of the Department of Social and Historical Disciplines systematically monitor the knowledge of students about the Great Patriotic War, improve teaching methods, use an individual approach, and conduct extracurricular activities. Possible steps to increase the productivity of this work may be the return to the educational process of the discipline "The Great Patriotic War of the Soviet People (in the context of World War II)", at least at the level of an elective, as well as the preservation of historical disciplines in the process of training specialists in the correspondence form of study.



УДК 378.1



**Карпович А.М.**, старший преподаватель

*Учреждение образования «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*


# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КУРАТОРА УЧЕБНОЙ ГРУППЫ В ВЫСШЕМ УЧЕБНОМ ЗАВЕДЕНИИ


**Аннотация.** В статье рассмотрена роль куратора в различных видах работ, проводимых со студентами в учреждениях высшего технического образования. Рассмотрены отдельные направления работы куратора, виды и формы реализации деятельности куратора.

**Abstract.** The article examines the role of the curator in various types of work carried out with students in institutions of higher technical education. The separate directions of the curator's work, types and forms of realization of the curator's activity are considered.



**Ключевые слова.** Куратор, воспитательная работы, профориентационная деятельность, личностные качества, педагогическая система, родители.

**Keywords.** Curator, educational work, career guidance, personal qualities, pedagogical system, parents.